Лічбавая інфраструктура ў Беларусі расце

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі як орган рэгулятар забяспечвае паўнацэннае і ўсебаковае развіццё інфармацыйна-камунікацыйнай інфраструктуры для задавальнення ўзрастаючых патрэбнасцей дзяржавы, бізнесу і грамадзян у атрыманні сучасных і якасных паслуг электрасувязі.

Неабходна адзначыць, што на сённяшні дзень ліцэнзію ў галіне электрасувязі маюць 154 аператары электрасувязі.

Асноўны напрамак развіцця сеткі электрасувязі РУП "Белтэлекам" – завяршэнне працэсу пераключэння абанентаў на праграмна-апаратную IMS-платформу, што дае магчымасць прадастаўляць абанентам увесь спектр сучасных тэлекамунікацыйных паслуг па адной абаненцкай лініі. На канец справаздачнага квартала да IMS-платформы падключана больш за 3,8 млн. абанентаў (хатніх гаспадарак). Будаўніцтва мультысэрвісных сетак дазваляе не толькі палепшыць якасць і пашырыць пералік паслуг, але і аптымізаваць выдаткі на эксплуатацыю сетак электрасувязі.

З улікам развіцця паслуг сеткі перадачы даных расце колькасць падключэнняў да паслуг шырокапалоснага доступу, што ўплывае і на шырыню знешняга канала доступу ў сетку Інтэрнэт. Знешні шлюз для доступу ў сетку Інтэрнэт пастаянна пашыраецца таксама для павышэння якасці паслуг па доступе ў сетку Інтэрнэт, рэзервавання і памяншэння нагрузкі на асобныя напрамкі. За студзень-верасень 2025 года шырыня знешняга канала для доступу ў сетку Інтэрнэт была павялічана на 870 Гбіт/с і склала на 1 кастрычніка 2025 г. 5 090 Гбіт/с.

З мэтай мадэрнізацыі існуючых сетак перадачы даных для паляпшэння якасці і аб'ёму паслуг прадаўжаліся работы па падключэнню абанентаў з прымяненнем тэхналогіі пасіўных аптычных сетак (GPON), якая дае магчымасць забяспечыць хуткасць перадачы даных да 100 Мбіт/с і вышэй.

Па стане на 1 кастрычніка 2025 г. колькасць абанентаў (хатніх гаспадарак), падключаных па дадзенай тэхналогіі, склала каля 3 132,3 тыс. і павялічылася з пачатку года на 79,4 тысячы.

Усяго колькасць абанентаў стацыянарнага шырокапалоснага доступу да сеткі Інтэрнэт склала 3 367,8 тыс. з прыростам да пачатку года ў 83,6 тыс., пры гэтым узровень пранікнення стацыянарнага шырокапалоснага доступу да сеткі Інтэрнэт на 100 жыхароў склаў 37,0 адзінак.

Забяспечана далейшае развіццё паслуг сотавай рухомай электрасувязі. Па стане на 1 кастрычніка 2025 года агульная колькасць абанентаў сотавай рухомай электрасувязі ў рэспубліцы склала 11 970 тыс. Узровень пранікнення сотавай рухомай электрасувязі ў рэспубліцы склаў 131,4 абанента на 100 жыхароў. Сотавай рухомай электрасувяззю другога і трэцяга пакалення ахоплена 99,3 працэнтаў і 98,6 працэнтаў тэрыторыі рэспублікі адпаведна, на якой пражывае 99,9 працэнтаў насельніцтва.

Актыўна развівалася сетка сотавай рухомай электрасувязі стандарту LTE і паслугі на яе аснове.

За студзень-верасень 2025 года ахоп насельніцтва паслугамі сотавай рухомай электрасувязі стандарту LTE склаў 99,6 працэнтаў.

Развіццё сетак сотавай рухомай электрасувязі трэцяга і чацвёртага пакалення забяспечвае стабільны рост абанентаў бесправаднога шырокапалоснага доступу да сеткі Інтэрнэт: колькасць абанентаў бесправаднога шырокапалоснага доступу да сеткі Інтэрнэт па выніках мінулага квартала 2025 года склала 9 605,2 тыс. з пранікненнем паслуг у 105,4 адзінак на 100 жыхароў.

Малюнак

Source URL: *https://mpt.gov.by/cifrovaya-infrastruktura-v-belarusi-rastet*